85.315
К 215

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МІНСКІ ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ
Факультэт мастацкай творчасці
Кафедра духавой музыкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

КАРАЦЕЕЎ А.Л.

# ЗМЕСТ І ПРАКТЫЧНАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ НАВУЧАЛЬНА-ТВОРЧАГА ПРАЦЭСУ Ў АРКЕСТРЫ ДУХАВЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ

/арганізацыйна-метадычныя, мастацка-выканальніцкія аспекты работы аматарскага і прафесійнага калектыву/

Навучальна-метадычны дапаможнік
па методыцы работы з ансамблем і аркестрам духавых інструментаў для кіраўнікоў калектываў, студэнтаў стацыянара і факультэта завочнага навучання Мінскага інстытута культуры спецыялізацыі "Аркестры духавых інструментаў"

МІНСК -- 1993 г.

Намеснік дэкана факультэта мастацкай творчасці, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт кафедры духавой музыкі

КАРАЦЕЕЎ А.Л.

Рэцэнзенты:

кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры аркестравага дырыжыравання

КУЗЬМІНІЧ М.Л.

намеснік дэкана факультэта мастацкай творчасці, заслужаны работнік культуры Беларусі, дацэнт кафедры духавой музыкі

ЖЫГІН С.І.

Рэкамендавана да выдання прэзідыумам метадычнага Савета Мінскага інстытута культуры /пратакол № 8 ад 24.12.1991 г./.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод пераліку дысцыплін новага навучальнага плана спецыяльнасці № 05.25.00 "Мастацкая творчасць" для спецыялізацыі "Духавыя аркестравыя інструменты"[ж] вядучае месца заклікаены займаць курс "Методыка работы з ансамблем і аркестрам духавых інструментаў". Вывучэнне гэтага курса прадвызначае разгляд кола праблемных пытанняў, якія датычацца дзейнасці як самадзейных /аматарскіх/, так і прафесійных духавых аркестравых саставаў.

Нельга абысці увагай той факт, што дагэтуль не сціхаюць дыскусіі спецыялістаў-практыкаў, вучоных, што даследуюць праблему развіцця прафесійнага і самадзейнага мастацтва. Так, Ю.Кулікоў, разглядаючы культуралагічны аспект тэорыі самадзейнага мастацтва, падкрэслівау, што самадзейнасць -- гэта новая сацыякультурная форма непрафесійнага мастацтва і шырэй -- народнай творчасці. Даволі грунтоўна праблема узаемаадносін прафесійнага і самадзейнага мастацтва была разгледжана на другім фестывалі мастацкай самадзейнасці сацыялістычных краін у г.Брно пры абмеркаванні рэфератаў І.Вітані /Венгрыя/, С.Гарстэан /Румынія/, М.Гарташ /Чэхаславакія, Л.Сонцавай /СССР/.

Улічваючы практыку прыцягнення у самадзейныя духавыя аркестравыя калектывы прафесійных выканаўцаў[жж], якая аб"ектыўна склалася, у час правядзення аглядаў, конкурсаў, фестываляў і да т.п. пастаянна узнікаюць спрэчкі: якія ж калектывы аднесці да самадзейных, а якія -- да аматарскіх? Свае версіі наконт гэтага прапанавалі, напрыклад, Д.Браслаўскі і Г.Сальнікаў на навукова-практычнай канферэнцыі, што праходзіла ў час правядзення першага Усесаюзнага свята духавой музыкі /Мінск, 1977 г./.

Мы зыходзім з таго, што тэрмін "самадзейны калектыў" не падыходзіць да тых калектываў, якія уключаюць энтузіястаў жанру -- або прафесійных музыкантаў, або аматараў, бо і тых і дру-

ж кваліфікацыя -- "Дырыжор духавога аркестра. Выкладчык спецыяльных дысцыплін. Кіраўнік аматарскага аб"яднання.

жж ваенныя музыканты, аркестранты прафесійных саставаў, удзельнікі навучальных калектываў дзіцячых музычных школ, музычных вучылішчаў, кансерваторый, інстытутаў культуры і да т.п.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гіх аб"ядноўвае агульнасць і выбіральнасць і н т а р э с у да заняткаў, выступленняў у саставе мастацкага калектыву ў свой вольны час. Розніца паміж удзельнікамі заключаецца ва у з р о ў н і  і х  п а д р ы х т о ў к і. Таму, на наш погляд, тэрмін "самадзейны выканаўца" не адпавядае удзельніку мастацкага калектыву сферы вольнага часу, таму што ў рамках такога калектыву ён не займаецца самадзейнасцю як такой, а удасканальвае сваё выканальніцкае майстэрства, эмацыянальна развіваецца і духоўна узбагачаецца пад кіраўніцтвам прафесійнага дырыжора і знаходзіцца ў пастаянных міжасобасных зносінах з іншымі удзельнікамі калектыву, якія таксама аказваюць прамы або ускосны ўплыў на яго станаўленне як асобы. Самадзейным жа выканаўцам як такім, можа называцца, на наш погляд, асобны выканаўца-энтузіяст /гітарыст, гарманіст, выканаўца на якім-небудзь фальклорным інструменце, у тым ліку і на духавым, і да т.п./. У гэтым ракурсе правамерна разглядаць і дзейнасць самадзейных мастакоў, кампазітараў, фатографаў і г.д., якія, у сілу прыроднай адаронасці, настойлівай рабоце і самаадукацыйнай працы дасягаюць пэўных мастацкіх вынікаў. Таму, не ўдаючыся ў падрабязны разгляд гэтай праблемы, у дадзенай рабоце замест тэрміна "самадзейны" духавы аркестр, які традыцыйна выкарыстоўваецца, намі даецца назва "аматарскі" духавы аркестр. Наша пазіцыя супадае і з пунктам гледжання Л.Аляксеевай, якая адзначае, што ў сапраўдным мастацтве не можа быць розных мерак, розных патрабаванняў, ці гэта з"яўляецца мастацтва прафесійным або самадзейным. Крытэрыі мастацтва, на думку гэтага аўтара, -- гэта высокамастацкі ўзровень, эстэтычнае задавальненне запатрабаванняў людзей[1].

Курс "Методыка работы з ансамблем і аркестрам духавых інструментаў" значна шырэйшы толькі за рэпетыцыйныя пытанні работы з аркестрам, коле якіх нават некаторыя выкладчыкі памылкова лічаць зусім дастатковым для падрыхтоўкі студэнтаў да будучай прафесійнай работы з аркестрам. Каб падрыхтоўка студэнтаў ажыццяўлялася мэтанакіравана, эфектыўна і па аб"ектыўных параметрах, аўтарам гэтай работы былі напісаны метадычныя указан-

---

1 Алексеева Л. Диалог ученых // Клуб и художественная самодеятельность. -- 1981. -- № 9. -- С. 8.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ні[1] і па заказу Усесаюзнага метадычнага кабінета па навучальных установах мастацтваў і культуры спецыяльна распрацавана праграма для інстытутаў культуры і мастацтваў краіны[2]. Такі падыход да дадзенага курса дазваляе студэнтам у час яго вывучэння апрабіраваць свае веды, атрыманыя і па іншых практычных дысцыплінах спецыялізацыі: дырыжыраванне, аркестравы клас, спецінструмент, інструментальны ансамбль, вывучэнне аркестравых інструментаў, методыка навучання ігры на спецінструменце і інструментах духавога аркестра, інструментоўка і інш. Усе віды і формы заняткаў па курсу методыкі работы з ансамблем і аркестрам духавых інструментаў*, якія арыентуюцца на узровень ужо набытых пэўных прафесійных навыкаў, усё ж маюць канкрэтную накіраванасць і змест. Так, матэрыялы лекцыйнага курса дазваляюць студэнтам вывучыць пытанні тэорыі і методыкі работы з духавым аркестрам у кантэксце яго эвалюцыі і сучасных тэндэнцый развіцця. У час індывідуальных і практычных заняткаў гэтыя веды ўжо рэалізуюцца з улікам канкрэтных сітуацый з іх варыянтнымі зьяненнямі, у залежнасці ад розных фактараў і абставін, якія складваюцца ў канкрэтным аркестравым калектыве. А на семінарскіх занятках студэнтам прадастаўляецца рэальная магчымасць пазнаёміцца з тыповымі і нават нетыповымі праблемнымі сітуацыямі, што ўзнікаюць у тым ці іншым духавым аркестры, дзе студэнты праходзяць навучальную разгрупаваную практыку. У ходзе іх абмеркавання і магчымых дыскусій будучыя кіраўнікі калектываў змогуць бліжэй вывучыць праблемы і, тым самым, агарадзіць сябе ад магчымых памылак у час будучай прафесійнай сваёй дзейнасці з духавым аркестравым калектывам.

Такім чынам, курс "Методыка работы з ансамблем і аркест-

---

I Коротеев А.Л. Методика работы с самодеятельным оркестровым коллективом /духовой, эстрадный оркестр/. -- Методические указания и тематический план лекционных, практических занятий. -- Минск, 1986. -- 38 с.

2 Коротеев А.Л. Методика работы с самодеятельным оркестровым коллективом. -- Программа для институтов культуры и искусств... /специализация "Руководство самодеятельным духовым оркестром"/. -- М., 1991. -- 26 с.

ж лекцыі, семінары, практычныя і індывідуальныя заняткі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рам духавых інструментаў", яго практычныя заняткі, накіраваныя на аб"ектыўнае бачанне студэнтамі як агульных, так і прыватных праблем, якія спадарожнічаюць дзейнасці калектываў, павінен адыграць, па нашаму перакананню, станоўчую ролю ў справе далейшага развіцця духавога аркестравага выканальніцтва. Матэрыялы гэтага навучальна-метадычнага дапаможніка мы адрасуем і кіраўнікам духавых аркестраў, бо разгледжаныя намі праблемы і аргументаваны падыход да іх вырашэння пакуль не знаходзяць належнай увагі з іх боку, што самым негатыўным чынам адбіваецца на сацыяльным прэстыжы духавой аркестравай музыкі.

x x
x

## І. АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ НА БАЗЕ АМАТАРСКАГА ДУХАВОГА АРКЕСТРА І ІХ РОЛЯ Ў ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ БУДУЧЫХ КІРАЎНІКОЎ ДУХАВЫХ АРКЕСТРАВЫХ КАЛЕКТЫВАЎ

Калі ў час наведвання прафесійных духавых аркестравых саставаў студэнтаў прыцягвае, перш за ўсё, стабільнасць работы дырыжора з падрыхтаванымі аркестрантамі, укамплектаваным саставам, то гэтага нельга сказаць пра многія аматарскія калектывы. Тут, як правіла, правядзенне рэпетыцыйных заняткаў, функцыяніраванне аркестра звязана з цэлым шэрагам цяжкасцей, мноствам непрадказальных праблемных момантаў. Таму спынімся больш падрабязна менавіта на пытаннях правядзення практычных заняткаў у аматарскім духавым аркестры, хоць некаторыя моманты характэрныя і для прафесійных саставаў.

Ужо першыя наведванні аркестравага калектыву дазваляюць студэнтам пазнаёміцца як з агульнымі пытаннямі, якія датычацца арганізацыі дзейнасці аркестра, так і з прыватнымі момантамі, што ўзнікаюць у той ці іншай канкрэтнай сітуацыі. Як правіла, студэнты, якія мелі да ВНУ поўны вопыт практычнай работы з аматарскімі калектывамі /аркестр, ансамбль трубачоў, трамбаністаў, кларнетыстаў і да т.п., ансамбль гарністаў і барабаншчыкаў і інш./ на поўным узроўні могуць ужо самастойна арыентавацца па асноўных напрамках навучальнай і творчай работы. Але грунтоўнае



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

вывучэнне дзейнасці канкрэтнага базавага калектыву дазволіць і гэтай катэгорыі студэнтаў, і тым навучэнцам, якія яшчэ не сутыкаліся з падобнай практыкай, дэталёва і грунтоўна вывучыць мноства ўзнікаючых сітуацый, што складваюцца ў штодзённай рабоце з удзельнікамі аматарскага аркестра. Кожныя практычныя заняткі падрабязна разглядаюцца выкладчыкам са студэнтамі, прычым пасля асобных пытанняў і іх усебаковага аналізу студэнтам рэкамендуецца ўносіць у індывідуальны "Дзённік назірання работы калектыву" найбольш т ы п о в ы я  п р а б л е м ы, якія ўзнікаюць у ходзе правядзення рэпетыцыйных заняткаў аркестра або іншага віду дзейнасці калектыву. Прапануем іх адзначаць такім чынам:

| №№ п/п | Змест заняткаў | Рашэнне пытання ў базавым калектыве | Магчымая варыянтнасць рашэння праблемы на думку студэнта |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1. | Рэпетыцыя з няпоўным саставам аркестра з-за адсутнасці некаторых удзельнікаў па аб"ектыўных прычынах /службовая дзейнасць, сямейна-бытавыя абставіны і да т.п./. | Кіраўнік праводзіць рэпетыцыю, вызначыўшы канкрэтныя задачы для сябе, а таксама для удзельнікаў няпоўнага састава аркестра. | 1/ На першую гадзіну рэпетыцыі пакідаецца адна аркестравая група, на другую гадзіну — другая. Удзельнікі, не занятыя ў групавой рэпетыцыі на першай або другой гадзіне, самастойна альбо пад кіраўніцтвам канцэртмайстраў груп працуюць над аркестравымі партыямі. 2/ Арганізацыя на працягу усёй рэпетыцыі пачарговай работы над партыямі з той або іншай аркестравай групай над пэўнай лічбай з наступным агульнааркестравым выкананнем асобных фрагментаў партытуры або работа над творам. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| I | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|
| 2. | Работа з ансамблямі духавых і ударных інструментаў. | Сумеснае выкапанне твораў або практыкаванняў і карэкціроўка гучання у выпадку магчымых памылак. | 1/ Папярэдняе знаёмства удзельнікаў ансамбля з музычным матэрыялам шляхам ілюстрацыі /фанаграма, выкананне твора на фартэпіяна, найбольш падрыхтаванымі удзельнікамі або запрошанымі музыкантамі/ з мэтай максімальнага засваення удзельнікамі ансамбля выканальніцкіх мастацкіх задач.<br>2/ Папераменная работа з асобнымі удзельнікамі ансамбля над найбольш складанымі фрагментамі для наступнага дасягнення выканальніцкага майстэрства усім саставам у гэтых фрагментах або творы у цэлым. |
| 3. | Правядзенне індывідуальных заняткаў з удзельнікамі аркестра. | Работа над аркестравымі партыямі. | 1/ Работа па прапанаванай сістэме папярэдняй размінкі і правядзенне асноўных заняткаў.<br>2/ Работа над практыкаваннем, гамай або эцюдам, а затым — развучванне аркестравай або ансамблевай партыі, работа над інструментальнай п"есай або сольным творам у суправаджэнні аркестра, аркестравага сола. |

На наш погляд, такі падыход да зместу заняткаў дапаможа будучым кіраўнікам аматарскіх калектываў беспамылкова і апера-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тнуна арыентавацца ў аналагічных сітуацыях, якія будуць узнікаць і ў іх прафесійнай дзейнасці з музыкантамі-аматарамі.

У час знаёмства з матэрыяльнай базай аркестра студэнтам мэтазгодна вывучыць наглядмае афармленне і гукаакустычныя асаблівасці аркестравай студыі, наведаць памяшканні для індывідуальных заняткаў, пазнаёміцца з фондам бібліятэкі аркестра, а таксама намаляваць эскізы або асобныя элементы касцюмаў аркестра з мэтай магчымага іх выкарыстання ў сваёй будучай прафесійнай дзейнасці.

Важным момантам, на які трэба звярнуць увагу студэнтам, з'яўляецца аналіз рэпертуару, што выконваецца базавым аркестравым калектывам. Гэта будзе садзейнічаць не толькі пашырэнню ведаў студэнтаў па аркестравай літаратуры ў яе рэальным гучанні, уключаючы розныя нетыражыраваныя новыя творы, інструментоўкі, апрацоўкі, але і на канкрэтных прыкладах усвядоміць методыку работы над тым ці іншым творам. У час арганізацыі практычных заняткаў па курсу "Методыка работы з ансамблем і аркестрам духавых інструментаў", праходжання разгрупаванай навучальнай практыкі студэнтам, з мэтай больш дэталёвага вывучэння твораў, прадастаўляецца магчымасць самім стаць удзельнікамі аматарскага духавога аркестра. Гэта дазваляе студэнтам у канкрэтнай аркестравай групе, як кажуць — "знітры", асабіста усвядоміць найбольш тыповыя складаныя моманты ў аркестравых партыях, якія маюць пэўныя цяжкасці для удзельнікаў аматарскага мастацкага калектыву. Але вынікі студэнтаў па гэтаму віду заняткаў не павінны зводзіцца толькі да павышэння асабістага майстэрства, набыцця аркестравага выканальніцкага вопыту, пашырэння ведаў па аркестравай літаратуры з мэтай стварэння уласнай картатэкі для фарміравання рэпертуару свайго будучага калектыву. Галоўнай мэтай, на наш погляд, гэтага віду практычных заняткаў у любым калектыве павінен стаць аналіз псіхолага-педагагічных узаемаадносін, якія складваюцца на рэпетыцыях паміж кіраўніком і удзельнікамі калектыву. Гэта ў многім дазволіць студэнтам прадбачыць у сваёй будучай творчай дзейнасці варыянты тыповых памылак, што пастаянна ўзнікаюць у многіх аматарскіх калектывах. У дадзенай рабоце няма сэнсу падрабязна мадэліраваць праблемныя сітуацыі — яны ўзнікаюць у час выканання канкрэтнага мастацкага рэпертуару або ўзнікаюць на занятках па аркестрава-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ансамблевай падрыхтоўцы калектыву. Для нагляднасці прывядзем толькі два прыклады:

I/ Удзельнік адчувае псіхалагічную няўпэўненасць, загадзя хвалюецца ў час выканання, бо праз некаторы час павінен будзе сыграць складаны для яго фрагмент аркестравай партыі /нязручная аплікатура і не камбінацыя, высокая тэсітура для медных інструментаў і да т.п./.

Кіраўнік, нягледзячы на гэта, праследуючы мэту хутчэйшай падрыхтоўкі канцэртнай праграмы для бліжэйшага канцэрта, спрабуе праводзіць рэпетыцыю ў фарсіраваным рэжыме. Гэта, фактычна, прыводзіць да зрыву. Непадрыхтаваны аркестрант не ў стане "наскокам" справіцца з складаным заданнем, ён запрыгнаваны ў сваім бяссіллі, адчувае сябе няёмка перад кіраўніком і усімі ўдзельнікамі аркестра.

Выснова з дадзенага прыкладу можа быць наступнай: у час дарэпетыцыйнай работы над творам і ў час студыйных рэпетыцыйных заняткаў арыентавацца на ўзровень падрыхтоўкі к о ж н а г а свайго аркестранта. У выпадку наяўнасці ў канкрэтнага ўдзельніка якіх-небудзь аркестравых цяжкасцей кіраўнік прапануе яму не выконваць на рэпетыцыі гэтыя фрагменты і затым ужо у індывідуальным парадку вырашыць усе ўзніклыя пытанні. Калі і такі падыход не прыносіць жаданых вынікаў, то кіраўніку застаецца альбо абыходзіцца сіламі астатніх удзельнікаў дадзенай аркестравай групы, у саставе якой іграе гэты ўдзельнік, альбо запрасіць выканаўцу для такой аркестравай партыі з іншага калектыву.

2/ Удзельнік у тым або іншым творы выконвае сола, але яно не заўсёды гучыць стабільна, паколькі ён адчувае часам празмернае сцэнічнае хваляванне.

Кіраўнік, аб"ектыўна ацэньваючы такое становішча спраў, пачынае наладжваць своеасаблівы "конкурс" -- прапануе гэта сола выканаць то аднаму, то другому аркестранту. Але, напрыклад, у першага выканаўцы -- прыгожы тэмбр, а астатнія прэтэндэнты валодаюць альбо добрай дробнай тэхнікай, альбо -- тонкім пачуццём фразіроўкі, альбо -- большай упэўненасцю ігры ў верхнім рэгістры, альбо -- дынамічнай кантраснасцю гучання і г.д. Пасля такіх праслухоўванняў кіраўнік ніяк не можа вызначыцца ў салісце і выбірае таго, хто на дадзены момант яму спадабаўся. Але

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цвёрдай упэўненасці ў тым, што гэта будзе самы аптымальны варыянт, у яго ўсё ж няма, і таму кіраўніку застаецца спадзявацца толькі на шчаслівы выпадак.

Выснова: кіраўніку ў час выканання гэтага сола на канцэрце трэба поўным чынам падбадзёрыць свайго саліста мімікай, эмацыянальнымі жэстамі, асабістай сабранасцю, падтрымаць лаканічнымі рэплікамі і да т.п. А ў выпадку магчымых памылак адпрацаваць на студыйнай рэпетыцыі і паўтарыць на канцэрце такі магчымы варыянт выйсця са становішча, якое стварылася: у выпадку няўдачы выканаўцы ў якімсьці фрагменце яго сола ўзмацніць гучанне аркестравага акампанементу загадзя агавораным на рэпетыцыі жэстам, паказаць уступ для далейшага правядзення сола таму з астатніх аркестрантаў групы, які па сваіх выканальніцкіх якасцях больш за ўсё падыходзіць для завяршэння сольнага эпізоду.

Адным з адказных момантаў практычных заняткаў студэнтаў у аматарскім духавым аркестры з'яўляецца іх работа з удзельнікамі калектыву па асновах гукаатрымання і ўдасканальванню выканальніцкага майстэрства. Магчымасць арганізацыі і непасрэднага правядзення практычных заняткаў з канкрэтным удзельнікам аматарскага калектыву дазваляе кожнаму студэнту рэальна ацаніць сваю педагагічную падрыхтоўку, авалоданне пытаннямі методыкі навучання ігры на інструменце і г.д. Студэнту важна памятаць, што ён "укліньваецца" у адпрацаваны рытм навучальна-выхаваўчай і творчай работы калектыву, і таму ў час самастойнай такой своеасаблівай практыкі абавязаны гэта становішча абавязкова у л і ч в а ц ь. Нягледзячы на асабістую зацікаўленасць выпрабаваць сябе па ўсіх параметрах прафесійнай падрыхтоўкі, студэнту пажадана не брацца за ўсё адразу, а вызначыць канкрэтную задачу, але вырашыць яе ўжо да канца. Студэнт, напрыклад, можа свае веды апрабіраваць па наступных накірунках:

1/ Работа з удзельнікамі аркестра над гамамі, эцюдамі, практыкаваннямі, аркестравымі партыямі.

2/ Арганізацыя з ліку ўдзельнікаў калектыву ансамблевых саставаў малых формаў /магчыма і нават п а ж а д а н ы асабісты ўдзел студэнта-практыканта ў саставе ансамбля ў якасці выканаўцы вядучай партыі/.

3/ Работа над мастацкім рэпертуарам. Ажыццяўляючы свае за-

няткі у гэтым напрамку, акрамя работы над асобнымі творамі або іх фрагментамі, студэнт у скарбонку багажу сваіх ведау павінен адбіраць найбольш тыповыя і праблемныя пытанні, каб іх затым прадбачыць у сваёй прафесійнай дзейнасці.

Вывучэнне вопыту работы аматарскіх калектывау дазваляе зрабіць выснову аб тым, што пераважная большасць кіраунікоу /а гэта у поунай меры датычыцца і прафесійных дырыжорау духавых аркестрау/ работу па стварэнню ансамблевых саставау у сваіх аркестрах проста і г н а р у ю ц ь. Улічваючы неабгрунтаванасць і ганебнасць такіх адносін да работы з ансамблямі, студэнтам у час сваіх практычных заняткау неабходна удзяліць самую сур"ёзную увагу гэтаму напрамку сваёй работы у аматарскім калектыве. У гэтым выпадку набыты вопыт па арганізацыі і правядзенню заняткау з ансамблямі не застане маладога спецыяліста неспадзеукі пасля афармлення на работу. Калі у час наведвання аматарскага аркестравага калектыву пад кіраунііцтвам студэнта з"явіцца інструментальны ансамбль, мэтазгодна не толькі паказаць гэты састау для справаздачы на практыцы, але і вызначыць для сябе, якім чынам падрыхтаваныя творы можна уключыць у канцэртную праграму калектыву з мэтай яе тэматычнай і жанравай разнастайнасці.

Такім чынам, арганізацыя, змест і правядзенне практычных заняткау на базе аматарскага аркестра духавых інструментау — адзін з складаных і адказных напрамкау навучальна-выхаваучага працэсу падрыхтоукі спецыяліста, таму што яны уключаюць не толькі работу над музычнымі творамі, але і дазваляюць адабраць найбольш яркія і тэматычна апрауданыя творы для магчымага іх выкарыстання у час падрыхтоукі музычна-літаратурных кампазіцый, лекцый-канцэртау як вышэйшай формы канцэртна-выканальніцкай дзейнасці калектыву. А вось тут студэнту і спатрэбяцца самыя шырокія веды па гісторыі і мастацкай літаратуры, педагогіцы і псіхалогіі, тэорыі і методыцы арганізацыі мастацкай творчасці, інструментоуцы /аранжыроуцы/ і гісторыі музыкі, методыцы работы з ансамблем і аркестрам духавых інструментау і г.д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## П. АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ РАБОТЫ З ПАДРЫХТОЎЧАЙ ГРУПАЙ У АМАТАРСКІМ АРКЕСТРЫ ДУХАВЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ

Адным з важных момантаў у працэсе правядзення заняткаў на базе аматарскага духавога аркестра з"яўляецца вывучэнне праблемы фарміравання падрыхтоўчай групы у калектыве. У сувязі з тым, што гэтае абавязковае патрабаванне для стабілізацыі дзейнасці аматарскага калектыву і яго мэтанакіраванай работы не заўсёды выконваецца на практыцы ў сілу цэлага шэрагу аб"ектыўных цяжкасцей, то, на наш погляд, мэтазгодна гэта пытанне разгледзець спецыяльна.

### § I. Пытанні падрыхтоўкі выканаўцаў на духавых інструментах у гісторыі аркестравых калектываў Беларусі

Кожная праблема мае сваю гісторыю і перадгісторыю. У рамках станаўлення і развіцця духавога ансамблевага і аркестравага выканальніцтва ў Беларусі пытанне аб неабходнасці існавання у калектывах дакладнай сістэмы падрыхтоўкі вучняў для іх наступнага ўключэння ў аркестр або ансамбль разглядалася заўсёды.

Выказванні некаторых "спецыялістаў-практыкаў", культасветработнікаў аб тым, што паяўленне падрыхтоўчых груп у аркестрах, хорах -- гэта дасягненне, характэрнае толькі для савецкага перыяду рубяжа 1960--70-х гадоў, заслугоўвае самай сур"ёзнай крытыкі.

Дастаткова звярнуцца толькі да некаторых фактаў гісторыі мастацкай культуры Беларусі. Так, на рубяжы ХУІ--ХУП стст. на тэрыторыі сучаснай рэспублікі у розных кафедральных, уніяцкіх, пратэстанскіх і іншых школах існавалі пэўныя сістэмы навучання харавым спевам, ігры на розных духавых, струнных інструментах. Дакладная сістэма навучання была у так званых "бурсах музычных" пры іезуіцкіх манастырах. Як удалося устанавіць музыказнаўцу В.Дадзіёмавай, даволі шырокі выбар духавых музычных інструментаў для навучання вучняў быў пры Гродзенскай іезуіцкай бурсе /ХУШ стагоддзе/[I]. Вучні бурсы, або як іх называлі --

I Дадиомова О. Капелла иезуитской бурсы // Гродно: Энциклопед. справочник / Гл. ред. И.П.Шамякин. -- Минск, 1989. -- С.231.

"хлопцы", уваходзілі у састау інструментальнай капэлы, і ужо на першапачатковым этапе сваіх заняткау мелі магчымасць спалучаць навучанне з элементамі практыкі у аркестры. Па такім жа прынцыпе будавалася навучанне выканаўцаў на духавых інструментах для папаунення аркестравых саставау з ліку дзяцей прыгонных пры Слонімскім прыдворным тэатры М.Агіньскага /1770--80-я гг./, Ружанскім тэатры Сапегі, тэатральнай школе А.Тызенгауза у Гродні /1774--1780-я гг./ і г.д. Цікавыя і факты падрыхтоўкі музыкантау для папаунення асноунага саставу у аркестры Гомельскай музычнай школы у першай палове XIX стагоддзя[1], у аркестры І.Дабравольскага у Магілёве /пачатак XIX стагоддзя/, Мінскім гарадскім духавым аркестры /XIX стагоддзе/[2] і інш.

Калі весці нават гаворку толькі пра так званы савецкі перыяд, то дастаткова адзначыць, што ужо у 1930-я гады пры духавым аркестры шклозавода пасёлка Касцюкоука Гомельскай вобласці у 1935 годзе была утворана падрыхтоучая група для пачынаючых музыкантау-аматарау.

Калі разглядаць дадзенае пытанне на сённяшнім этапе развіцця духавых аркестрау, то як самыя яркія прыклады па арганізацыі падрыхтоучых груп у калектыве можна прывесці работу Э.Сянкевіча /народны духавы аркестр БелАЗа у г. Жодзіна/, М.Падлуцкага /народны духавы аркестр Мінскага радыётэхнічнага інстытута/.

Таму, пры аналізе дзейнасці аматарскага духавога аркестравага калектыву, разглядзе пытання аб пераемнасці падрыхтоукі музыкантау, відавочным становіцца той факт, што стварэнне падрыхтоучай групы у аркестры -- аб"ектыуная неабходнасць, ці то вядзецца размова пра функцыяніруючы састау ці пра нанова ствараемы аркестр. Нягледзячы на асобныя індывідуальныя заняткі з удзельнікамі будучага аркестра, напрыклад, кіраунік не змож абмежавацца толькі гэтым відам заняткау. Рана ці позна

---

1 Коротеев А.Л. Из истории оркестра Гомельской музыкальной школы /1830--1840 гг./ // Вопр. культуры и искусства Белоруссии. -- Мн., 1987. -- Вып. 6. -- С. 70--76.

2 Коротеев А.Л. Из истории духовых оркестров Белоруссии XIX в. // Вопр. культуры и искусства Белоруссии. -- Мн., 1986. -- Вып. 5. -- С. 73--79.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перад удзельнікамі узнікнуць праблемы не толькі па развіццю індывідуальных, але і с у м е с н ы х в ы к а н а л ь н і ц к і х н а в ы к а ў, калі кіраўнік будзе паступова уводзіць найбольш падрыхтаваных удзельнікаў падрыхтоўчай групы, спрабаваць правесці аб"яднанне выканаўцаў для стварэння свайго першага аркестра. Менавіта таму работа кіраўніка з удзельнікамі падрыхтоўчай групы, на наш погляд, павінна разглядацца ў двух аспектах:

1/ методыка і арганізацыя заняткаў з мяркуемымі удзельнікамі з мэтай стварэння новага арганізуемага калектыву;

2/ змест і накіраванасць заняткаў з удзельнікамі падрыхтоўчай групы з мэтай папаўнення саставу аркестра, які ўжо функцыяніруе.

## § 2. Фарміраванне падрыхтоўчай групы як асновы для стварэння аматарскага духавога ансамбля або аркестра духавых інструментаў

Першы з указаных намі аспектаў з"яўляецца першапачатковым этапам па стварэнню новага калектыву, прычым размова можа весціся альбо аб стварэнні толькі ансамбля духавых інструментаў, каб кіраўнік ужо ў пачатку сваёй працоўнай дзейнасці здолеў паказаць канкрэтна-мастацкія вынікі і не выслухоўваць магчымыя папрокі адміністрацыі наконт адсутнасці аркестравага саставу як такога, альбо размова можа весціся аб стварэнні духавога аркестра ўжо нават на першапачатковым этапе яго фарміравання, што, безумоўна, арганізаваць даволі складана.

Калі мы будзем разглядаць умовы фарміравання падрыхтоўчай групы як асновы для стварэння аматарскага альбо ансамбля, альбо аркестра духавых інструментаў, то неабходнымі момантамі ў гэтым плане нам уяўляюцца наступныя:

-- наяўнасць поўнага камплекта музычнага інструментарыя для фарміравання ансамбля або аркестравага саставу /як правіла -- малога меднага духавога аркестра/, а таксама абсталявана з улікам асаблівасцей акустыкі, памяшканне для агульнааркестравых або групавых, дробнагрупавых, індывідуальных і самастойных заняткаў удзельнікаў;

-- эдабранне кіраўніком група мяркуемых удзельнікаў, які

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выказалі жаданне займацца у аматарскім аркестры духавых інструментау /удзельнікі могуць мець, а могуць і не мець пэунай музычнай падрыхтоукі і папярэдняй выканальніцкай практыкі/;

— правільнае размеркаванне кірауніком адабраных удзельнікау для заняткау у падрыхтоучай групе па канкрэтных інструментах, зыходзячы з фізіёлага-анатамічных даных будучых музыкантау-аматарау /віды прыкусу, адсутнасць магчымых фізічных недахопау і да т.п./;

-- арыентацыя кіраўніка на падбор і вызначэнне для удзельнікау найбольш прыймальных і прагрэсіуных сістэм навучання удзельнікау ігры на духавых і ударных інструментах, якія для удзельнікау падрыхтоучай групы будуць даступныя, што ім дазволіць за параўнальна кароткі для сябе тэрмін авалодаць асновамі гукаатрымання, гукавядзення, а таксама будуць садзейнічаць развіццю у музыкантау-аматарау пэуных тэхнічных навыкау і выканальніцкіх прыёмау.

## § 3. Змест, накіраванасць і арганізацыя заняткау з удзельнікамі падрыхтоучай групы аматарскага саставу духавога аркестра

Пасля таго, калі будуць вырашаны пытанні размеркавання удзельнікау падрыхтоучай групы па інструментах, кіраунiку для дакладнай рэгламентацыі і эфектыунасці сваёй работы лепш за усё вызначыцца у пытаннях фіксацыі вынікау сваіх патэнцыяльных аркестрантау для асноунага саставу, вызначэнні перспектыуных планау-заданняу для іх. З гэтай мэтай магчыма пакарыстацца вядзеннем спецыяльнага "Дзённіка" або "Перспектыунага плана работы кірауніка аматарскага аркестра духавых інструментау з удзельнікамі калектыву".

Пачынаючы арганізацыю заняткау з членамі падрыхтоучай групы, кірауніку у першую чаргу трэба выходзіць з іх выканальніцкіх магчымасцей. На першапачатковым этапе такой работы галоуным пытаннем павінна стаць навучанне удзельнікау асновам г у к а а т р ы м а н н я, а таксама разуменне і тэхналогія пісьменнага г у к а в я д з е н н я. Ад таго, наколькі з першых жа заняткау члены падрыхтоучай групы змогуць усвядоміць увесь складаны комплекс гэтых напрамкау сваёй падрыхтоукі, бу-

дзе залежыць я к а с н а - т э м б р а в ы бок іх выканання, а значыць, і аркестра у цэлым. На наш погляд, значную карысць тым, хто навучаецца на медных духавых інструментах, прынясуць заняткі па сістэме Луіса Маджыо, сістэма "базінга" і інш.

Мэтазгодна, напрыклад, пасля усведамлення навучэнцамі п р ы н ц ы п у у прыёме "базінг" арганізаваць па гэтай тэме групавыя заняткі. Гэта дазволіць кіраўніку своечасова звяртаць увагу на тыя ці іншыя памылкі, што узнікаюць у кагосьці з навучэнцаў. А такі момант фіксацыі магчымых памылак, іх разбор дазволіць усім астатнім удзельнікам падрыхтоўчай групы на наглядным прыкладзе высветліць і ліквідаваць фактары іх паяўлення, каб пазбегнуць такіх тыповых або выпадковых недакладнасцей у сваіх занятках. Максімальная доля нагляднасці, метадычнае тлумачэнне кіраўніка, практычнае асэнсаванне асаблівасцей такога прыёму, як "базінг", акажуць пераканаўчы эфект у заняцці разглядаемага напрамку.

Адным з момантаў, што не павінен пайсці з поля зроку студэнтаў-практыкантаў, якія займаюцца з падрыхтоўчай групай /а гэта у поўнай меры датычыцца і кіраўнікоў дзеючых калектываў/, павінна стаць выкананне прыёму "базінга" і яго "падстрахоўка" для выверэння і карэкціроўкі чысціні інтанацыі з дапамогай меладычнага голасавядзення на фартэпіяна або музычным інструменце студэнта /кіраўніка/. Акрамя унісонных варыянтаў работы над практыкаваннямі у дасягненні "базінга" на муштуку або губах, можна арганізаваць вывучэнне і работу над гэтым прыёмам у інтэрвальным і акордавым выкладанні для развіцця у навучэнцаў гарманічнага слыху /тэрцыі, кварты, квінты, мажорныя і мінорныя трохгучнасці, секстакорд, квартсекстакорд палавіннымі нотамі у сярэднім тэмпе/.

Пачынаючы непасрэднае развіццё навыкаў ігры на інструменце, лепш за усё ісці аналагічным шляхам -- спалучаць індывідуальныя і групавыя заняткі пад кіраўніцтвам студэнта-практыканта або кіраўніка калектыву з удзельнікамі падрыхтоўчай групы. Прынцып нагляднасці у такім плане адыграе сваю станоўчую ролю. Але галоўнае, на што трэба абавязкова звярнуць увагу, заключаецца у падборы музычнага матэрыялу унісоннага або акордавага выкладання у час правядзення сумесных групавых заняткаў. Такі падыход прадугледжвае пастаянную канцэнтрацыю увагі на пытаннях

развіцця навыкаў ансамблевага выканання. А гэта ўжо непасрэдна прывядзе да вырашэння задачы д а а р к е с т р а в а й в ы к а н а л ь н і ц к а й п а д р ы х т о ў к і навучэнцаў. Што датычыцца падбору музычнага матэрыялу, то лепш за усё пры адборы ўдзяляць увагу тым творам, якія ўжо вядомы удзельнікам падрыхтоўчай групы, тыя практыкаванні, якія лягчэй засвойваюцца навучэнцамі ў плане інтанацыйнага успрыняцця і яго наступнага ўзнаўлення на інструменце. Тут важна улічыць і розныя ўзроставыя катэгорыі удзельнікаў /дзеці, падлеткі і г.д./ з іх асаблівасцямі, ступенню устойлівасці да эмацыянальна-псіхалагічных і фізічных нагрузак.

### § 4. Некаторыя асаблівасці правядзення заняткаў з удзельнікамі падрыхтоўчай групы ў дзеючым аматарскім аркестры духавых інструментаў

Тыя кіраўнікі, якія думаюць аб перспектывах творчай дзейнасці сваіх калектываў, акрамя усеабдымнай работы з асноўным саставам надаюць сур"ёзную увагу пастаяннаму функцыяніраванню падрыхтоўчай групы, якая, па меры падрыхтоўкі не асобных удзельнікаў для уключэння ў асноўны аркестравы састаў, папаўняецца усё новымі і новымі удзельнікамі. Пэўны вопыт работы ў гэтым напрамку у рэспубліцы ёсць. Сярод лепшых калектываў у цяперашні час -- народны духавы аркестр БелАЗа /г.Жодзіна, кіраўнік Сянкевіч Э.П./[1], народны духавы аркестр Мінскага радыётэхнічнага інстытута /кіраўнік Падлуцкі М.П./[2]. Але усё ж арганізацыя падрыхтоўчай групы ў к о ж н ы м дзеючым духавым аркестры рэспублікі патрэбнасцю і нормай пакуль яшчэ не стала. Адсюль і нестабільнасць дзейнасці шэрагу калектываў /раптоўны уход аркестрантаў па тых ці іншых сямейна-бытавых абставінах, прызыў у армію, адсутнасць своечасовай замены і да т.п./. Каб

---

1 Коротеев А.Л. Основные направления учебно-воспитательной и творческой работы самодеятельного духового оркестра // Вопр. культуры и искусства Белоруссии, вып. 2. -- Мн.: Вышэйшая школа, 1983. -- С. 126--127.

2 Коротеев А.Л. Будни и праздники духовой музыки // Клуб и художественная самодеятельность. -- 1986, № 7. -- С. 16.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

змяніць такое становішча спраў, кіраўнікам, асабліва маладым спецыялістам, трэба пісьменна і з жаданнем для сябе арганізаваць неабходныя заняткі.

Безумоўна, планы работы з падрыхтоўчай групай пры асноўным саставе будуць крыху адрозніваццa ад тых момантаў, якія мы разглядзелі ў папярэдніх параграфах прымянялъна да падрыхтоўчай групы як асновы для стварэння духавога аркестра на яго першапачатковым этапе фарміравання. Тым не менш, прынцыповых разыходжанняў тут не адбудзецца. Справа ў тым, што ў падрыхтоўчай групе пры ўжо дзеючым саставе новыя ўдзельнікі прыходзяць не разам, а, пераважна, па адным, па два. Гэта арыентуе кіраўніка на ўзмацненне зместу індывідуальных заняткаў удзельнікаў. У сілу рознай падрыхтоўкі нанава прынятых і ўжо навучаючыхся ўдзельнікаў падрыхтоўчай групы кіраўніку ўсё ж мэтазгодна вар"іраваць састаў удзельнікаў для дробнагрупавых заняткаў па два--тры чалавекі. Але затым неабходна праводзіць і больш узбуйненыя групавыя заняткі з адпаведным падборам музычнага матэрыялу, што будзе даступны і навічкам, і музыкантам-аматарам, якія ўжо атрымалі пэўную выканальніцкую практыку. Такое спалучэнне для сумесных заняткаў падцягне навічкоў, стабілізуе выканальніцкія навыкі астатніх удзельнікаў. А ў цэлым кіраўнік будзе паслядоўна весці сваю работу. Як паказчык вынікаў і для кіраўніка, і для ўдзельнікаў падрыхтоўчай групы, і для ўсіх аркестрантаў стане ўключэнне лепшых "подготовишек" у асноўны састаў хаця б для выканання адной--трох і больш аркестравых партый мастацкіх твораў калектыву. За гэтым жа адбудзецца новая плённая работа "подготовишек" і іх імкненне абавязкова трапіць у асноўны састаў аркестра.

Каб стварыць спакойную, творчую атмасферу на занятках, кіраўніку можна на некаторых занятках адмовіцца ад традыцыйнай формулы "Строгі настаўнік -- пакорлівы і паслухмяны вучань", а прыцягваць з асноўнага саставу сваіх лепшых аркестрантаў, якія дапамогуць і псіхалагічна, і практычна навічкам адаптавацца і дабіцца поспеху па прынцыпу "Чым я горшы за іншых?".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Ш. ПЫТАННІ АРГАНІЗАЦЫІ МАСТАЦКА-АСВЕТНІЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ДУХАВОГА АРКЕСТРАВАГА КАЛЕКТЫВУ

/прафесійныя і аматарскія саставы/

Вывучэнне зместу і накіраванасці практычнай работы ў аматарскім духавым аркестравым калектыве паказвае, што найбольш праблематычна абстаіць справа з усведамленнем кіраўнікамі калектываў неабходнасці ажыццяўлення не проста канцэртнай дзейнасці, а нацэльванне іх на вырашэнне менавіта мастацка-арганізацыйных, асветніцкіх пытанняў для самай шырокай аўдыторыі з мэтай папулярызацыі жанру духавой аркестравай музыкі, музычнага мастацтва ў цэлым, вырашэннем у поўнай ступені пытанняў музычна-эстэтычнага, эмацыянальнага выхавання слухачоў і удзельнікаў і да т.п. Разгледзім абазначаную намі праблему больш падрабязна.

### § І. Асноўныя задачы мастацка-асветніцкай дзейнасці духавых аркестраў і музычна-эстэтычныя формы выхавання іх удзельнікаў і слухачоў

Кожны кіраўнік павінен быць з"арыентаваны на тое, што адной з самых важных задач пры арганізацыі навучальна-выхаваўчага і творчага працэсу ў аматарскім духавым аркестры, калі аркестр выступае з канцэртнай праграмай на дастаткова прымальным мастацкім узроўні аматарскага калектыву, з"яўляецца м у з ы ч н а - э с т э т ы ч н а е   в ы х а в а н н е як удзельнікаў калектыву, так і аўдыторыі слухачоў. Такі від дзейнасці калектываў трэба разглядаць у рамках музычна-славеснай формы работы па музычна-эстэтычнаму выхаванню і удзельнікаў, і слухачоў. Значнасць і неабходнасць правядзення такой работы відавочная, хоць, як паказвае сучасная практыка функцыяніравання прафесійных і аматарскіх духавых аркестраў, калектывы ў сваёй выканальніцкай дзейнасці абмяжоўваюцца толькі акадэмічнай формай канцэртнага выступлення або ілюстрацыйна-прыкладной кампіляцыяй музычна-тэматычнага матэрыялу для афармлення сацыяльназначымых, культурна-масавых мерапрыемстваў з частковым выкарыстаннем элементаў тэатралізацыі. Калі ў прафесійных духавых

аркестраў задачы т р а д ы ц ы й н ы я — паступальнае развіццё, удасканальванне выканальніцкага майстэрства і папулярызацыя жанру, гэта значыць у дадзеным выпадку толькі музычна-асветніцкая дзейнасць, то аматарскія калектывы ўсё ж заклікаю ны вырашаць зусім іншыя задачы, сярод якіх асноўнымі, на наш погляд, з"яўляюцца наступныя:

I/ прадастаўленне магчымасці л ю б о м у жадаючаму займацца аматарскім выканальніцтвам для развіцця асобасных якасцей /мастацкае ўяўленне, творчыя навыкі, магчымасць індывідуальнага самавыяўлення, эстэтычнае узбагачэнне і г.д./;

2/ арганізацыя зносін у сферы дзейнасці вольнага часу як па творчых, так і па іншых пытаннях у рамках свайго "мікра"-клуба па інтарэсах;

3/ безумоўнае накапленне мастацкага патэнцыялу аматарскага калектыву з перспектыўным арыенцірам на канцэртнае выступленне і г.д.

I у прадстаўленай разнастайнасці гэтых даволі складаных па сацыяльнай значнасці задач, не апошняе месца павінна займаць м а с т а ц к а - а с в е т н і ц к а я работа. Менавіта гэты аспект і не улічваецца як кіраўнікамі аматарскіх калектываў, так і метадыстамі жанру у АНМЦ, МДСТ, якія абавязаны дапамагаць у арганізацыі кіраўнікам такой работы. Вядома, такое становішча спраў наклала свой негатыўны адбітак на "згортванне" асветніцкай дзейнасці аматарскіх духавых аркестраў з неабходнымі музычна-мастацкімі ілюстрацыямі, а таксама ўнесла дэзарганізацыю у іх работу — абмежаванне толькі канцэртнымі выступленнямі і іх узвядзенне у ранг абсалютнай самамэты. Трэба заўважыць, што захапленне работай па падрыхтоўцы у калектывах складанымі канцэртнымі праграмамі прыводзіць да таго, што такія выступленні не заўсёды маюць каштоўнасць з мастацкага пункту гледжання. Акрамя гэтага у наяўнасці і вымушаная пагоня кіраўніка за накапленнем калектывам выкананых мерапрыемстваў: канцэртаў, выступленняў на аглядах, конкурсах і да т.п. /ганебнасць выканання такіх колькасных паказчыкаў, якія зыходзяць ад афіцыйных інстанцый, даўно заслугоўвае грунтоўнай крытыкі!/. Таму, каб будучым кіраўнікам калектываў захаваць першароднасць аматарскіх аркестраў, не загружаць іх чужымі задачамі, неабходна пераасэнсаваць важнасць і прыярытэтнасць мастацка-асветніц-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кай работы сіламі кіраўніка і удзельнікаў аматарскага духавога аркестра.

У рамках калектываў з мэтай комплекснага музычна-эстэтычнага выхавання і павышэння агульнаадукацыйнага ўзроўню удзельнікаў, ступені іх эрудыцыі можна абмежавацца рознага роду каментарыямі да развучваемых твораў, расказамі пра музычнае мастацтва, а таксама кіраўніку альбо самому, альбо сіламі удзельнікаў арганізаваць захапляючыя музычныя інфармацыі /"Калейдаскоп музычных навін", "Музычны глобус" і да т.п./. Як найбольш дзейсныя рычагі у такой рабоце могуць шырока выкарыстоўвацца гутаркі, якім характэрны давяральныя спосабы перадачы пэўнага аб"ёму ведаў удзельнікам калектыву або слухачам. З 1970-х гадоў шырокае распаўсюджанне атрымала спалучэнне літаратурнага мантажу з музычнымі нумарамі духавога аркестра ў час выступленняў калектываў на аглядах, конкурсах, фестывалях. Нярэдка найбольш падрыхтаваныя кіраўнікі аркестраў самі выступаюць з змястоўнымі лекцыямі, арганізоўваюць тэматычныя лекцыі-канцэрты. Асаблівых навыкаў, эрудыцыі і прафесіяналізму патрабуе стварэнне музычна-літаратурных кампазіцый, якія актыўна пачалі праводзіцца ваеннымі духавымі аркестрамі[1].

Але з усёй разнастайнасці адзначаных намі музычна-славесных формаў па музычна-эстэтычнаму выхаванню удзельнікаў аркестраў і слухачоў, найбольш аптымальнымі як па ўспрыняццю, так і па тэхналогіі увасаблення, з"яўляюцца гутаркі. Кожны кіраўнік, калі ён займаецца іх арганізацыяй у сваім калектыве, інтуітыўна арыентуецца як на неабходную тэматыку, так і на вырашэнне арганізацыйна-метадычных пытанняў.

### § 2. Практычныя пытанні па адбору музычна-тэматычнага і інфармацыйна-пазнавальнага матэрыялу для мастацка-асветніцкай дзейнасці калектыву

Большасць кіраўнікоў аматарскіх калектываў не могуць з"арыентавацца ў арганізацыйна-практычных пытаннях, каб затым

1 Коростелев Б. Музыкально-литературная композиция -- активная форма концертной деятельности военных оркестров // В помощь военному дирижеру, вып. XIУ. -- М., 1977. -- С. 67--68. -- 125 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паспяхова займацца музычна-выканальніцкай і мастацка-асветніцкай дзейнасцю сіламі свайго духавога аркестра. Становішча справу ускладняецца тым, што да цяперашняга часу поунасцю адсутнічала кола спецыяльнай такой літаратуры. Таму л ю б а я новая партытура для аматарскага духавога аркестра, метадычная р а с п р а ц о у к а па асноуных напрамках такіх калектывау, чарговая п у б л і к а ц ы я практыка пра канкрэтны вопыт работы выклікае павышаную цікавасць і адпаведны рэзананс сярод спецыялістау. Сярод рознай падобнай літаратуры заслужаную увагу выклікае чарговае выданне Пермскага АНМЦ народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы -- зборнік "Грае духавы аркестр" /цыкл гутарак-канцэртау пра духавую музыку/, выпушчаны тыражом 3 000 экземплярау пры удзеле Федэрацыі аматарскіх клубау "Творчасць" і аматарскага аб"яднання кампазітарау Прыкам"я*. Гэты зборнік, аутарам-складальнікам якога з"яуляецца метадыст АНМЦ, заслужаны работнік культуры Расіі В.І.Ліцман, прыцягне увагу студэнтау і спецыялістау-практыкау не толькі як чарговае папауненне нотнага арсеналу для пашырэння рэпертуару аматарскага духавога аркестра. Цыкл гутарак-канцэртау В.Ліцмана прымусіць многіх кіраунікоу аматарскіх калектывау задумацца над нявырашанымі імі праблемамі у плане арганізацыі ненавіта м а с т а ц к а - а с в е т н і ц к а й работы у поуным аб"ёме гэтай дзейнасці. Адзначым, што і да цяперашняга часу у нас яшчэ не з"яуляліся якія-небудзь матэрыялы гутарак, якія, напрыклад, распрацавау В.Ліцман. А яны дазваляюць кіраунікам калектывау і метадыстам жанру мець канкрэтнае візуальнае уяуленне, своеасаблівы узор, які дазваляе спецыялістам намеціць свае самастойныя шляхі па падрыхтоуцы цыклау гутарак-канцэртау, лекцый-канцэртау, тэматычных вечароу, пасяджэнняу Клуба аматарау духавой музыкі і да т.п. Перавага рэкамендуемых інфармацыйных сцэнарыяу у спалучэнні з прапанаванымі партытурамі заключаецца у тым, што яны збліжаюцца з лекцыямі-канцэртамі. Тэматычная накіраванасць зборніка энтузіяста В.Ліцмана дазваляе папоуніць рэпертуар аматарскіх духавых аркестрау ге-

* часткова гэта пытанне намі разглядалася у наступнай публікацыі: Коротеев А. "Играет духовой оркестр" // Культурно-просветительная работа. -- 1991, № 2. -- С. 40.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

роіка-патрыятычнымі і эстраднымі творамі.

Цыкл гутарак-канцэртаў адкрывае славуты і надзвычай папулярны ў музычным свеце марш В.Агапкіна "Развітанне славянкі", напісаны 28-гадовым ваенным трубачом з прычыны балканскіх падзей 1912 года. Інфармацыйная падборка дазваляе кіраўнікам калектываў па сваім угледжанні кампанаваць тыя ці іншыя цікавыя факты з жыцця вядучага ваеннага дырыжора, як, напрыклад, яго удзел у рабоце камісіі па ўдасканальванню бою гадзінніка Спаскай вежы Крамля і асабістай настройкі перазвону курантаў*. Сярод розных твораў для духавых аркестраў вядучае месца займае і канцэртны марш М.Іванова-Радкевіча "Капітан Гастэла", прысвечаны герайчнаму подзвігу лётчыка скораснага бамбардзіроўшчыка, які Мікалай Гастэла здзейсніў на беларускай зямлі. Мелодыка-тэматычны матэрыял гэтага героіка-трагічнага твора, напісанага ў трохчасткавай форме, пабудаваны па прынцыпу кантраснага супастаўлення імпульсіўна-накіраваных, рашуча-кідкіх і глыбока-драматычных інтанацый. Неабходна падкрэсліць, што гэты твор упрыгожыць любую канцэртную праграму духавога аркестра, бо ён з'яўляецца ўжо класікай духавой музыкі /аб чым сведчыць папулярнасць гэтага твора і афіцыйнае прызнанне, калі ў 1943 годзе кампазітар за шэраг маршавых твораў, у тым ліку і "Капітан Гастэла", быў удастоены Дзяржаўнай прэміі СССР/.

Для кампаноўкі нумароў героіка-патрыятычнай тэматыкі канцэрта ў кіраўнікоў аркестраў выкліча цікавасць і твор Я.Русанава -- канцэртны марш-балада "Панфілаўцы", прысвечаны неўміручаму подзвігу 28 герояў, якія адбілі танкавую атаку немцаў пад Масквой. Нягледзячы на тэхнічна прыймальны для аматарскага духавога аркестра матэрыял, даступнасць тэсітуры, кіраўнікам прыйдзецца ў гэтым творы вырашыць і шэраг выканальніцкіх цяжкасцей: адпрацаваць унісонныя і актаўныя ўзыходзячыя пасажы трыццаць другімі ў флейт і кларнетаў у дыяпазоне дзвюх актаў, секстольны рух у тэнара і барытона, ідэнтычнасць захавання ўсімі ўдзельнікамі аркестра рэльефнасці пункцірнага рытму, сінкоп, трыольнай пульсацыі для дасягнення ансамблевага май-

---

* для большай інфармацыі рэкамендуем звярнуцца да кнігі: Соколов В. Прощание славянки: Жизнь и творчество В.И.Агапкина -- автора популярного марша. -- М., 1987.



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

стэрства у аркестравых групах.

Прыцягне увагу кіраўнікоў калектываў і "Франтавы марш" ваеннага дырыжора С.Вараб"ёва, які ўрыўкамі, паміж цяжкімі баямі, пісаў твор, прысвечаны гераічнай абароне Сталінграда. Тэматычнае развіццё гэтага марша свой пункт адліку бярэ ад энергічна-кідкага армейскага сігнала "Трывога", які і вызначае меладычную накіраванасць і характар асноўнага выкладання матэрыялу з яго раптоўнымі ўзлётамі ад мінімальнай дынамікі да "фортэ", "падганяючым" асноўныя матывы пункцірным рытмічным малюнкам /  /, меладычнай напеўнасцю партый тэнара і барытона ў трыо і іх упэўнена-шырокія рухі кантрапункта.

У сувязі з тым, што з канца 1950-х гадоў духавыя аркестры пачалі ўключаць у свой рэпертуар эстрадныя творы /а падобная тэндэнцыя захоўваецца і развіваецца і ў цяперашні час/, цяперашнія і будучыя кіраўнікі духавых аркестраў змогуць пашырыць творчы арсенал свайго калектыву "Серэнадай для трубы з духавым аркестрам", напісанай уральскім кампазітарам-аматарам А.Гаражаніным. Яснае гарманічнае суправаджэнне, арыентаванае на эстрадную манеру выканання, дазваляе салісту максімальна прадэманстраваць тэмбравы каларыт, асабліва ў вытрыманых гуках, і віртуозную тэхніку як ва ўступе, так і ў іншых эпізодах твора.

Такім чынам, разгледжаны матэрыял хаця б часткова дазволіць зняць некаторыя праблемныя пытанні дадзенага плана.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З А К Л Ю Ч Э Н Н Е

У гэтым невялікім навучальна-метадычным дапаможніку не прадстаўляецца магчымым разглядзець усе аспекты практычнай накіраванасці навучальна-выхаваўчага і творчага працэсу ў аркестры духавых інструментаў. Нягледзячы на спробу выяўлення трох асноўных праблемных напрамкаў у рабоце аркестра духавых інструментаў, асноўная ўвага, з-за вастрыні цяперашняй сітуацыі, была ўдзелена усё ж аматарскаму калектыву.

І выпускнікам інстытута культуры — будучым кіраўнікам аматарскіх духавых аркестраў, і цяперашнім кіраўнікам, усе закранутыя намі моманты неабходна асэнсаваць прымяняльна да канкрэтна ўзнікаючых сітуацый, з якімі яны сутыкнуцца або сутыкаюцца ў сваіх аркестрах.

Стварэнне і зацвярджэнне ў чэрвені 1992 г. новага навучальнага плана для інстытута культуры, які прынцыпова змяніў праходжанне навучальна-азнаямленчай, навучальна-педагагічнай, арганізацыйна-метадычнай і вытворчай практыкі, дазваляе студэнтам максімальна апрабіраваць і пашырыць аб"ём сваіх ведаў, развіць канкрэтныя навыкі і набыць неабходныя уменні. Перавага новага падыходу да арганізацыі практыкі неаспрэчная і яна заключаецца ў тым, што навучальна-азнаямленчая практыка /П курс/ і навучальна-педагагічная /Ш курс/ з"яўляюцца р а з г р у п а в а н ы м і і прадугледжваюць адпаведна двух- і чатырохгадзінныя заняткі ў тыдзень. Гэта дазваляе студэнтам нават у якасці практыкантаў займацца не проста адным з відаў навучальнай работы, а прывыкаць псіхалагічна, практычна да р э ж ы м у і п р а б л е м сваёй будучай прафесійнай дзейнасці /час правядзення заняткаў з музыкантамі-аматарамі, асаблівасці планавання работы з імі, вызначэнне зместу заняткаў, асабліва з удзельнікамі падрыхтоўчай групы, улік рэальных умоў рэпетыцый аркестра/.

Таму першачарговым патрабаваннем да будучых кіраўнікоў, як нам уяўляецца, павінна стаць не "школярскае" выкананне навучальных праграм, а творчы <u>пошук</u> арыгінальных формаў і метадаў работы з аркестрантамі, накапленне аптымальных мастацка-выканальніцкіх, арганізацыйна-метадычных рашэнняў па тых ці іншых праблемных пытаннях навучальна-выхаваўчага і творчага працэсу аркестра духавых інструментаў.

ЗМЕСТ

Ад аутара ........................................ 3

I. АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ НА БАЗЕ АМАТАРСКАГА ДУХАВОГА АРКЕСТРА І ІХ РОЛЯ Ў ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ БУДУЧЫХ КІРАЎНІКОЎ ДУХАВЫХ АРКЕСТРАВЫХ КАЛЕКТЫВАЎ. 6

П. АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ РАБОТЫ З ПАДРЫХТОЎЧАЙ ГРУПАЙ У АМАТАРСКІМ АРКЕСТРЫ ДУХАВЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ................ 13

§ I. Пытанні падрыхтоўкі выканаўцаў на духавых інструментах у гісторыі аркестравых калектываў Беларусі. 14

§ 2. Фарміраванне падрыхтоўчай групы як асновы для стварэння аматарскага духавога ансамбля або аркестра духавых інструментаў .................................. 15

§ 3. Змест, накіраванасць і арганізацыя заняткаў з удзельнікамі падрыхтоўчай групы аматарскага саставу духавога аркестра .................................. 16

§ 4. Некаторыя асаблівасці правядзення заняткаў з удзельнікамі падрыхтоўчай групы у дзеючым аркестры духавых інструментаў .................................. 18

Ш. ПЫТАННІ АРГАНІЗАЦЫІ МАСТАЦКА-АСВЕТНІЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ДУХАВОГА АРКЕСТРАВАГА КАЛЕКТЫВУ /прафесійныя і аматарскія саставы/ .................................. 20

§ I. Асноўныя задачы мастацка-асветніцкай дзейнасці духавых аркестраў і музычна-эстэтычныя формы выхавання іх удзельнікаў і слухачоў ...................... 20

§ 2. Практычныя пытанні па адбору музычна-тэматычнага і інфармацыйна-пазнавальнага матэрыялу для мастацка-асветніцкай дзейнасці калектыву ................ 22

Заключэнне .................................. 26

ЗМЕСТ І ПРАКТЫЧНАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ НАВУЧАЛЬНА-ТВОРЧАГА ПРАЦЭСУ Ў АРКЕСТРЫ ДУХАВЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ

/арганізацыйна-метадычныя, мастацка-выканальніцкія аспекты работы аматарскага і прафесійнага калектыву/

Складальнік: КАРАЦЕЕЎ А.Л.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падпісана ў друк 13.01.1993г. Фармат 60х 84. 1/16. Папера друкарская №2. Афсетны друк. Умоўны друк арк. 1.57. Ул-выд. арк. 1,38. Тыраж 50. Заказ 15. Бесплатна.

Ратапрынт Мінскага інстытута культуры, 220001, Мінск, вул. вул. Рабкораўская, 17.